■ Нотны радок

# ПАД ФАНФАРЫ

**У гэтыя дні віншаванні прымае Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі. Але папраўдзе віншаваць трэба ўсіх тых, хто любіць хадзіць на канцэрты: да гэтага юбілею прымеркаваны шэраг выступленняў замежных і айчынных выдатных музыкантаў. Фактычна ўся снежаньская афіша музычных імпрэз натхнёная гэтым святам. Яго могуць лічыць сваім выкладчыкі і студэнты, выпускнікі і партнёры, якіх вельмі шмат у акадэміі музыкі ў розных кутках свету. І нават тыя, хто яшчэ толькі марыць прыйсці ў гэтыя сцены ў якасці навучэнца. З думкай пра іх існуе і музычная навука, таму падчас Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў гэтыя дні абмяркоўвалі актуальную тэму «Прафесійная музычная адукацыя на сучасным этапе: традыцыі і наватары. Да 85-годдзя Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі».**



**Рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, член Савета Рэспублікі, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Кацярына ДУЛАВА** удакладняе:

— Архіўныя матэрыялы даюць інфармацыю пра больш ранні перыяд утварэння кансерваторыі: указ, датаваны 1925 годам, сведчыў, што было прынята рашэнне аб стварэнні Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. А ўжо сам факт адкрыцця і пачатак функцыянавання ўстановы датуецца 1932 годам. Мяркую, што яшчэ да пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя было ўяўленне аб неабходнасці стварэння сістэмы прафесійнай музычнай адукацыі ў Беларусі.

Зараз мы можам доказна гаварыць пра тое, наколькі разнастайным і цікавым было культурнае і тэатральнае жыццё ў нашай краіне ў розныя перыяды яе гісторыі: у ВКЛ ці Рэчы Паспалітай, падчас знаходжання ў межах Расійскай імперыі, у гады існавання сучаснай беларускай дзяржавы. І раней былі ўстановы адукацыі, якія адначасова выконвалі функцыю культурных цэнтраў: калегіумы, музычныя тэхнікумы ў Віцебску, Мінску, Магілёве. Гэта асобная тэма: наяўнасць падрыхтоўчага этапу, стварэнне музычнага асяроддзя, таго ж Беларускага музычнага таварыства. Адметны сам факт, што ў непростыя часы, калі толькі ішло станаўленне эканомікі новай дзяржавы, думкі, у тым ліку дзяржаўных людзей, былі звязаны з культурай.

...Важнай акалічнасцю ў гэтым працэсе стала запрашэнне выдатных дзеячаў савецкай — расійскай — музычнай культуры і адукацыі для таго, каб выхоўваць нашы нацыянальныя кадры. Сёння мы ганарымся, што многія з вядучых прафесараў Беларускай акадэміі музыкі былі першымі вучнямі выдатных дзеячаў Санкт-Пецярбургскай, Маскоўскай кансерваторый, такіх, як вучань Рымскага-Корсакава Васіль Залатароў. Пазней з'явілася практыка навучання найлепшых выпускнікоў нашай школы пры кансерваторыі ў вядучых ВНУ Расіі, каб яны потым вярталіся і выхоўвалі наступнае пакаленне беларускіх музыкантаў.

Падыход быў акадэмічны, але, з другога боку, у нас адкрыўся адзін з вядучых кірункаў — факультэт народных інструментаў: ён развіваецца, і цікавасць студэнтаў да спецыяльнасцяў, звязаных з народным выкананнем, не згасае. Тады ж прыходзілі працаваць выдатныя майстры, самародкі, як тыя ж Жыновіч ці Жыхараў...

У цяперашні час па кожнай спецыяльнасці ў нас ёсць не проста майстар, а яго творчая школа. Гэта самы лепшы варыянт развіцця выканальніцкага кірунку, калі ёсць выдатны педагог (напрыклад, піяніст, скрыпач), які вядзе сваіх вучняў і перадае ім майстэрства: як здабываць гук, як інтэрпрэтаваць твор або той ці іншы стылявы кірунак. Таму нармальным з'яўляецца пытанне: «У каго ты вучыўся?»... Адзначаю піетэт, што існуе ў нашых выхаванцаў у адносінах да педагога, які падчас вучобы становіцца блізкім чалавекам...



Але за апошнія 3—4 гады больш за 20 чалавек з ліку нашых выпускнікоў працаўладкаваны ў Акадэміі музыкі. Ужо можна казаць, што мы фарміруем уласныя адукацыйныя традыцыі.

Сёння з задавальненнем магу гаварыць пра фартэпіянную школу, якую фарміруюць Ігар Алоўнікаў, Юрый Гільдзюк, Уладзімір Дулаў, Уладзімір Няхаенка. У нас працуе Ніна Шарубіна, якая вядзе вакальную справу. Ёсць школа харавога майстэрства, якую стварыў Віктар Роўда і традыцыі якой працягвае загадчык кафедры харавога дырыжыравання Інэса Бадзяка, школа выканання на духавых інструментах на чале з прафесарамі М. М. Волкавым, У. П. Скараходавым, Б. У. Нічковым, школа спеваў, найстарэйшым прадстаўніком якой з'яўляецца народная артыстка СССР, прафесар Т. М. Ніжнікава, школа выканання на беларускіх цымбалах, заснаваная І. І. Жыновічам, традыцыі якога плённа развівае сёння народны артыст Беларусі, прафесар Я. П. Гладкоў, і многія іншыя.

**Для аматараў музыкі цікавы сённяшні дзень айчыннага мастацтва, тыя, хто прыйдзе на змену майстрам. Але тут майстэрства набываюць нават у маладосці, сведчанне гэтага — юбілейная афіша, сярод імёнаў — лаўрэаты міжнародных конкурсаў. Нашы музыканты. Зоркі!..**

*Поўную версію інтэрв'ю з Кацярынай Дулавай чытайце ў газеце «ЛіМ».*

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

■ Ёсць нагода

# ФАРБЫ Ў ТАНЦАХ

**Так, сучаснасць мае свае аблічча... Але калі гучыць «Лявоніха», калі ые танцуюць з імпэтам, міжволі пачынаеш прытопваць, не думаючы, што сядзіш у глядзельнай зале, а яны — артысты — далёка на сцэне. Ці вось яшчэ «Рэпка» — так бы і дапамог выцягнуць...**

У рамках юбілейнага тура па Беларусі і па Еўропе ў Палацы Рэспублікі адбылся канцэрт ансамбля танца, музыкі і песні «Белыя росы». Такім чынам заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь, які існуе ў Гродне, адзначыў у сталіцы сваё 30-годдзе з праграмай «Фарбы свету». Але ж у гэтым свеце ёсць месца Беларусі — прыкметнае і ўтульнае. Пра што і сведчыць ансамбль, які мае свой вельмі пазнавальны стыль. Каларытныя танцы, відаць, прыцягваюць увагу замежнікаў. Напрыклад, у 1992 годзе ансамбль «Белыя росы» выступаў у Давосе на эканамічным форуме. І нездарма гэты калектыў прадстаўляе нашу дзяржаву падчас Дзён культуры ў розных краінах — ад Кітая да Іспаніі. Іспанская прэса нават прызнавала ансамбль з Беларусі найлепшым калектывам, які гастралюе. Што праўда: большую частку свайго часу ён праводзіць на канцэртных пляцоўках Еўропы, паказвае аблічча Беларусі, у прывабнасці заходняй яе часткі: бабуліны песні і танцы, фальклор гэтага асаблівага рэгіёна (ствараецца яго сучасныя пераладжэнні дзеля прыцягнення моладзі) падкрэсліваюць адметнасць культуры памежнай тэрыторыі.

Мастацкі кіраўнік і галоўны балетмайстар — заслужаная артыстка Беларусі Вера Войнава, якая працуе ў «Белых росах» з 1987 года. Яна сама ставіць танцы — нашы. А вось на пастаноўкі танцаў народаў свету запрашаюць найлепшых майстроў тых краін — яны ведаюць свой каларыт, могуць яго перадаць лепш. Што і было важна падчас падрыхтоўкі праграмы «Фарбы свету»: танцы нараджаюцца з ладу жыцця і характару народа.

Каб перадаць гэта — сыграць ды станцаваць — трэба быць прафесіяналамі. Сёння ў ансамблі ўсяго каля 90 чалавек: музычная група, хор, танцавальная група, усе прафесійныя артысты. Майстэрства ўзважана і адзначана: заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Белыя росы» з'яўляецца лаўрэатам Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта краіны.

**Ларыса ЦІМОШЫК.** *tsimoshyk@zviazda.by*



■ Выстаўка

# ГРАФІКА+

## Найлепшае з 2017-га і яшчэ крыху: у Палацы мастацтва прадстаўлены праект «Графіка года»

**Малюнак, акварэль, эстамп, лічбавыя тэхналогіі — творцы спрабавалі зачапіць тэхнікай, ідэяй, філасофскім падыходам і індывідуальнасцю. Паколькі ў выставачнай прасторы пад праект была выдзелена невялікая тэрыторыя, патрабаванні да твораў аказаліся сур'ёзныя. І прызоў арганізатары вылучылі толькі два — за арыгінальную графіку, дзе прадстаўлены малюнак, акварэль і змешаныя тэхнікі, і за друкаваную, якую можна дубліраваць (у гэтую ж намінацыю ўваходзяць лічбавы друк).**



Алесь НЕКРАШЭВІЧ, «Тэрмінатар».

— Хацелася паказаць самае лепшае з графікі, акрамя таго мы выставілі некалькі мастакоў з жывапіснага цэха — Зою Літвінаву, Зою Луцэвіч і Святлану Каткову, — расказвае **куратар выстаўкі старшыня секцыі графікі Беларускага саюза мастакоў Андрэй БАСАЛЫГА.** — Большасць работ датаваныя 2017 годам, хоць мы прынялі і некалькі твораў, зробленых раней, якія, тым не менш, у конкурсе «Графіка года» не разглядаліся.

У кожнай намінацыі было па тры прэтэндэнты. Пераможцамі ў намінацыі «Тыражная графіка» сталі Андрэй Савіч і Андрэй Кошалеў. Мастакі прадставілі праект «Дзень усіх святых. Карта для гульні». Дыплом у намінацыі «Тыражная графіка» за дзве працы, аб'яднаныя назвай «Архітэктура», атрымаў Андрэй Басалыга. Трэцім намінантам стала маладая мастачка Аліна Прастак, якая прадставіла лінагравюру. У намінацыі «Арыгінальная графіка» пераможцам стаў мастак-манументаліст Аляксандр Некрашэвіч, які прадставіў цікавы па стылізацыі твор «Тэрмінатар».

Адчуваецца, як розныя пакаленні творцаў захапіліся адной ідэяй і імкнуліся найбольш дакладна і зразумела данесці яе да гледача.

— Паколькі ў выстаўцы бяруць удзел прадстаўнікі маладога пакалення, можна гаварыць пра давер да іх, — падкрэслівае Андрэй Басалыга. — У маладога аўтара з'яўляецца стымул і цікавасць выстаўляцца разам з такімі мэтрамі, як, напрыклад, Зоя Літвінава, — гэта ж, сапраўды, дасягненне. Але тут мне не хочацца дзяліць мастакоў на пакаленні. У дадзеным выпадку вучацца не толькі маладыя, але і мэтры графікі: спрабуюць зразумець, чым жыве моладзь, як адчувае жыццё. Хоць наша школа моцная, мы не павінны замыкацца толькі ў яе рамках. Павінны быць і погляды ў сусветную прастору графічнага мастацтва. Нашай школе трэба не баяцца мяняцца, а спакойна ўспрымаць такую з'яву, як трансфармацыя.

**Вікторыя АСКЕРА**